# БАГАЧ ПА-ЧЫЖОЎСКУ






У мінулыя выхадныя ў сталіцы другі раз запар адбыліся восеньскія кірмашы. У кожным раёне Мінска і яго мікрараёнах клапатлівыя фермеры, дзяржаўныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы і працавітыя вяскоўцы-саматужнікі прывозілі і прадавалі лішкі ўраджаю, атрыманага на палетках, сотках, агародах і прысядзібных участках, у садах і гадавальніках, на ягадных плантацыях. Чым адметныя былі гэтыя гаманкія і шматлюдныя кірмашы? У першую чаргу тым, што яны супалі з часам, які спрадвеку ў нас называлі Багачом, — старажытным святам услаўлення ўраджаю і працы хлебаробаў.

Правядзенне восеньскіх кірмашоў на пляцоўцы каля спартыўнага комплексу «Чыжоўка-Арэна» — акцыя параўнальна новая, але яна ўжо прыжылася і палюбілася сталічным жыхарам, можна сказаць, стала традыцыяй. Да таго ж гэта самы вялікі з усіх сезоных кірмашоў. Нездарма чарговы раз я выправіўся здымаць менавіта ў мінскую Чыжоўку. А восеньскі кірмашовы сезон тут будзе працягвацца да апошніх выхадных кастрычніка.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Больш здымкаў з гэтай падзеі глядзіце на сайце zviazda.by*







